УСЕ СІЛЫ НА ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ

ДАКЛАД ПЕРШАГА САКРАТАРА ВІЦЕБСКАГА АБКОМА КПБ тав. А. Н. АКСЁНАВА

— 30—31 кастрычніка,— сказаў дакладчык, — адбыўся Пленум ЦК КПСС, які заслухаў і абмеркаваў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Брэжнева Л. І. аб ходзе выканання рашэнняў XXIII з'езда КПСС і Пленумаў ЦК па пытаннях сельскай гаспадаркі, а таксама аб знешнепалітычнай дзейнасці Палітбюро ЦК КПСС і прыняў адпаведныя пастановы.

Працоўныя Віцебскай вобласці, як і ўвесь савецкі народ, з глыбокім задавальненнем і гарачым адабрэннем сустрэлі рашэнні кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС, якія маюць велізарнае эканамічнае і міжнароднае значэнне.

У пастанове кастрычніцкага Пленума ЦК і ў дакладзе таварыша Л. І. Брэжнева дадзен глыбокі і ўсебаковы аналіз выканання рашэнняў XXIII з'езда КПСС і Пленумаў ЦК па пытаннях сельскай гаспадаркі, разгорнута шырокая праграма і вызначаны канкрэтныя шляхі далейшага ўздыму гэтай важнейшай галіны сацыялістычнай эканомікі.

Рашэнні Пленума пранізаны ленінскай думкай аб тым, што без трывалай сельскагаспадарчай базы «немагчыма ніякае гаспадарчае будаўніцтва». Ажыццяўленне гэтых рашэнняў забяспечыць яшчэ больш паскораныя тэмпы развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці ў нашай краіне.

Як адзначалася на Пленуме сельскагаспадарчай вытворчасці і павышэння яе эканамічнай эфектыўнасці. Калгасы і саўгасы значна лепш аснашчаны сельскагаспадарчай тэхнікай, атрымліваюць больш угнаенняў, лепш забяспечаны сродкамі на капітальнае будаўніцтва. Выраслі кадры, здольныя кваліфікавана кіраваць калгасна-саўгаснай вытворчасцю. Нарэшце, што самае важнае, нязмерна палепшыліся ўмовы жыцця і працы калгаснікаў і рабочых саўгасаў, вышэй узнялася іх працоўная і палітычная актыўнасць.

Вось чаму на гэтым пленуме асабліва важна крытычна прааналізаваць вынікі нашай работы, узважыць свае магчымасці і вызначыць практычныя меры па рашучаму паскарэнню тэмпаў развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці ў вобласці.

I

Аналізуючы ход выканання Дырэктыў XXIII з'езда і Пленумаў ЦК па пытаннях сельскай гаспадаркі, кастрычніцкі Пленум ЦК КПСС яшчэ раз з асаблівай сілай падкрэсліў, што ў паскораным развіцці сельскай гаспадаркі, інтэнсіфікацыі ўсіх яе галін па-ранейшаму галоўным застаецца ўсямернае павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур па 5,7 тоны арганічных угнаенняў нізкай якасці. З 4,5 тысячы гектараў папараў толькі на 100 гектарах быў пасеяны лубін на зялёнае ўгнаенне. У радзе гаспадарак з году ў год важнейшыя работы праводзяцца з грубымі парушэннямі агратэхнікі.

Райком КПБ належным чынам не выхоўвае кіруючыя кадры калгасаў і саўгасаў у духу высокай адказнасці перад партыяй за становішча спраў у сельскай гаспадарцы.

На пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі наша вобласць крытыкавалася за невыкананне планаў вытворчасці збожжа і бульбы ў бягучай пяцігодцы. Гэта павінна сур'ёзна ўстрывожыць удзельнікаў нашага пленума, кіруючы актыў.

За мінулыя тры гады калгасы і саўгасы вобласці недадалі 54 тысячы тон збожжа. Планы вытворчасці збожжа выкананы толькі ў Аршанскім, Докшыцкім, Талачынскім і Лёзненскім раёнах. У астатніх раёнах гэтыя планы не выкананы.

Асабліва пагражальнае становішча склалася ў Шумілінскім, Ушацкім, Міёрскім, Верхнядзвінскім і Браслаўскім раёнах, дзе вытворчасць збожжа да плана трох год пяцігодкі складае толькі 77 — 87 працэнтаў. І ўсё гэта тэмпаў росту вытворчасці як у адстаючых, так і ў перадавых і сярэдніх гаспадарках з'яўляецца важнейшым рэзервам павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў і ў прыватнасці вытворчасці збожжа.

Гэта крытыка прама датычыцца і некаторых іншых раёнаў нашай вобласці, дзе ўраджайнасць збожжавых працягвае заставацца амаль на адным і тым жа ўзроўні. Я маю на ўвазе Глыбоцкі, Аршанскі і Лёзненскі раёны.

Трэба спадзявацца, што партыйныя камітэты, кіраўнікі раёнаў і гаспадарак, усе працаўнікі нашых калгасаў і саўгасаў справай адкажуць на крытыку, забяспечаць атрыманне высокіх ураджаяў, паспяховае выкананне пяцігадовых планаў і абавязацельстваў па вытворчасці і нарыхтоўках збожжа, адстаяць пераходны сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў Беларусі, заваяваны вобласцю ў сацыялістычным спаборніцтве ў мінулым годзе.

Рашаючай умовай паскарэння тэмпаў развіцця сельскай гаспадаркі вобласці павінна стаць павышэнне культуры земляробства і ўсямерны рост ураджайнасці на кожным гектары зямлі. Як падкрэслівалася на кастрычніцкім Пленуме ЦК КПСС, гэта задача робіцца адной з галоўных.

Доследамі, праведзенымі Беларускім навукова-даследчым інстытутам земляробства, устаноўлена, што станоўчы баланс арганічнага рэчыва — гумусу, галоўнай часткі глебы, якая вызначае ўрадлівасць дзярнова-падзолістых глеб, дасягаецца пры штогадовым унясенні на гектар каля 10 тон арганічных угнаенняў. Пры меншай дозе, што мае месца ў радзе калгасаў і саўгасаў вобласці, гэтага не адбываецца. Таму запасы арганічнага рэчыва не ўзбагачаюцца, а пярэдка зніжаюцца. У такіх умовах і мінеральныя ўгнаенні даюць меншую эфектыўнасць.

Задача заключаецца ў тым, каб у кожнай гаспадарцы пры любых умовах уносіць на кожны гектар ворнай зямлі не менш як 10 тон арганічных угнаенняў. Вось чаму работу па вытворчасці і накапленню арганічных угнаенняў трэба лічыць першачарговай і важнейшай справай усіх нашых гаспадарак.

У мэтах арганізацыі круглагадавой вытворчасці і павышэння якасці арганічных угнаенняў, трэба ў кожным калгасе і саўгасе ў самы бліжэйшы час стварыць, дзе гэта яшчэ не зроблена, спецыялістаў і кіраўнікоў гаспадарак на барацьбу за тое, каб гэта было дасягнута.

З трыбуны пленума мы звяртаемся з асаблівым заклікам да ўсіх нашых аграномаў — заканадаўцаў палёў — узяць у свае рукі сцяг барацьбы за высокую культуру земляробства, стаць сапраўднымі арганізатарамі паходу за новыя поспехі паляводства!

Абласному ўпраўленню сельскай гаспадаркі, райвыканкомам і раённым упраўленням неабходна прыняць неадкладныя меры да паляпшэння работы са спецыялістамі калгасаў і саўгасаў, павышэння ролі аграхімічнай службы, яе ўдасканальвання, умацавання вытворчай базы і забеспячэння кваліфікаванымі кадрамі. Трэба сістэматычна і настойліва павышаць аграхімічныя веды кіраўнікоў сельскай гаспадаркі і аб'яднанняў «Сельгастэхніка», спецыялістаў калгасаў і саўгасаў у барацьбе з гэтым хранічным адставаннем зусім не адчуваецца.

Цярпець такое становішча партыйная арганізацыя далей не можа. Мы павінны рашуча ліквідаваць безадказнасць, якая мае месца ў рабоце па вырошчванню бульбы.

Неабходна ў зімовыя месяцы стварыць у кожным калгасе і саўгасе механізаваныя звенні па вырошчванню бульбы, падабраць і заштатдзіць звеннявых, навучыць іх агратэхніцы вырошчвання высокіх ураджаяў бульбы. Неабходна правесці звеннявымі семінары на базе калгаса імя Дзяржынскага Аршанскага раёна, звяне Героя Сацыялістычнай Працы т. Шынкарова.

Праўленні калгасаў і кіраўніцтва саўгасаў павінны правільна вырашыць пытанні аб адводзе ўчасткаў пад механізаванае вырошчванне бульбы, аб замацаванні за звеннямі трактараў і іншых машын, устанавіць стымулюючую аплату працы, меры матэрыяльнага і маральнага заахвочвання, набыць неабходную колькасць насення раяніраваных гатункаў бульбы. Спецыялісты гаспадарак павінны разам з механізатарамі распрацаваць падрабязныя планы падрыхтоўкі да сяўбы, увесь комплекс агратэхнічных прыёмаў па вырошчванню бульбы. У зімовы перыяд трэба арганізаваць нарыхтоўку неабходнай колькасці

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы